**дац. Шчэрба С.М.**

# Тэмы практычных заняткаў
# для студэнтаў 1 курса спецыяльнасці “Руская філалогія”
# па дысцыпліне “Гісторыя беларускай літаратуры”

## Тэма 1. Літаратура старажытнай Русі эпохі ранняга Сярэднявечча

1. Агульная характарыстыка Сярэднявечча як цэласнай грамадска-эстэтычнай фармацыі ў гісторыі даўнейшай літаратуры.
2. Мастацкая і жанрава-відавая спецыфіка сярэднявечнай літаратуры. Сінкрэтызм, фактаграфізм, наіўны гістарызм як родавыя рысы эстэтыкі літаратуры. Паняцце аб стылі манументальнага гістарызму.
3. Творы перакладной і арыгінальнай, рэлегійнай і свецкай літаратуры. Паняцце “літаратурнай трансплантацыі”.
4. “Біблія” як найвышэйшая духоўная каштоўнасць чалавецтва. Кампазіцыя. Звесткі пра евангелістаў.
5. “Аповесць мінулых гадоў” – мастацкі помнік літаратуры Кіеўскай Русі, энцыклапедыя жыцця ўсходніх славян. Падзеі і факты беларускай гісторыі ў летапісе.
6. Выдатныя дзеячы старабеларускіх земляў, іх уклад у развіццё пісьменства і культуры ўсходніх славян (Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўрамій Смаленскі, Лазар Богша, дойлід Іаан і інш.).
7. “Жыціе Еўфрасінні Полацкай” – арыгінальны помнік агіяграфічнай літаратуры. Вобраз гераіні. Паняцце аб аскетычным ідэале.
8. Кірыла Тураўскі – арыгінальны пісьменнік і прамоўца старажытнай Русі. Асоба. Мастацкія асаблівасці твораў К. Тураўскага (“Прытча пра душу і цела”, “Слова па Вялікадні”, інш.).
9. “Слова аб палку Ігаравым” – выдатны помнік свецкай літаратуры ранняга Сярэднявечча. Мастацкія асаблівасці твора. Вобраз аўтара, яго ідэйная пазіцыя і творчыя прынцыпы. Вобразная сістэма твора. Вобраз Усяслава Чарадзея ў выяўленні ідэйнага зместу твора. Праблема аўтарства. Пераклады на беларускую мову.

*КРЫНІЦЫ:*

Беларуская літаратура X–XV стст. / Уклад., прадмова, камент. І.В. Саверчанкі. – Мінск : Бел. Навука, 2010. – 410 с.

Літаратура XI–XVI стагоддзяў / Уклад. і камент. А.У. Бразгунова, І.У. Будзько, Л.В. Ляўшун ; прадм. У.В. Гніламёдава ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 766 с.

Старажытная беларуская літаратура : зборнік / Уклад. Л.С. Курбека ; аўт. прадм. У.Г. Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – С. 17–83.

*ЛІТАРАТУРА:*

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. Т.1. Даўняя літаратура : XI– першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 16–149.

*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:*

Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура : Падручнік / А.А. Лойка. – Мінск : Выш. школа, 2001. – С. 52–142.

## Тэма 2. Літаратура перыяду станаўлення ВКЛ (сяр. XIII–XIV ст.)

1. Беларуска-літоўскія летапісы як помнікі гісторыі і культуры беларускага народа. Іх наватарскі характар, класіфікацыя,кампазіцыя, характарыстыка асноўных цыклаў летапісных аповесцяў.
2. Гісторыя Княства і княжаскай дынастыі (ад Гедыміна і Альгерда да Ягайлы і Вітаўта) ў “Летапісцы вялікіх князёў Літоўскіх”. Міжусобіцы Белетрызацыя зместу, імкненне да займальнасці.
3. Палітычная канцэпцыя ВКЛ як славянскай дзяржавы ў летапісе 1446 года. Кампазіцыя твора. Змест аповесці аб паўстанні “чорнага люду” ў Смаленску. Вобраз ваяводы Андрэя Саковіча і стаўленне даяго аўтара.
4. Легендарныя аповесці аб заснаванні Вільні і паходжанні літоўскай знаці ад рымлян у “Хроніцы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага”. Вобраз Гедыміна і легенда аб “жалезным воўку”. Праблема ідэальнага зместу твора ў святле дадзеных сучаснай навукі (М. Улашчык, М. Ермаловіч, А. Краўцэвіч).
5. Гераічная гісторыя Беларусі і Вялікага княства Літоўскага ў “Хроніцы Быхаўца”. Апісанне паходаў Альгерда на Маскву, Грунвальдскай бітвы, княжання Міндоўга і Войшалка. Мастацкія асаблівасці беларуска-літоўскіх летапісаў. Іх уплыў на новую беларускую літаратуру.

*КРЫНІЦЫ:*

Анталогія даўняй беларускай літаратуры. – Мінск, 2003. – С. 238–253, С. 381–396.

Беларускія летапісы і хронікі / Уклад. У. Арлова ; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : “Беларуск. кнігазбор”, 1997. – С. 47–166.

*ЛІТАРАТУРА:*

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. Т.1. Даўняя літаратура : XI– першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 150–168.

Чамярыцкі, В. Сведкі нашай мінуўчыны / В. Чамярыцкі // Беларускія летапісы і хронікі / Уклад. У. Арлова ; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : “Беларуск. кнігазбор”, 1997. – С. 5–22.

*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:* Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура : Падручнік / А.А. Лойка. – Мінск : Выш. школа, 2001. – С. 166–177.

## Тэма 3. Літаратура эпохі Рэнесансу. Дзейнасць Ф. Скарыны

1. Еўрапейскі Рэнесанс як грамадская і гісторыка-культурная з’ява. Паняцце аб гуманізме. Эстэтычны ідэал і рэнесансавае разуменне прыгожага.
2. Сацыяльна-эканамічныя і гістарычныя перадумовы беларускага Адраджэння і яго адметныя, спецыфічныя рысы.
3. Ф. Скарына – тытан эпохі Адраджэння. Гуманіст, асветнік, мысліцель, заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання.

4. Грамадскія, філасофскія, маральна-этычныя погляды Ф. Скарыны. Яго ідэал чалавека і грамадства, патрыятычная формула.
5. Прадмовы і пасляслоўі Ф. Скарыны. Ідэйна-філасофскі змест прадмоў да Псалтыры, да ўсёй Біблii, да кніг "Іоў" і "Юдзіф".

*КРЫНІЦЫ:*

Францыск Скарына [предисловия] // Старажытная беларуская літаратура : зборнік / Уклад. Л.С. Курбека ; аўт прадм. У.Г. Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – С. 155–172.

Францыск Скарына [сказанні і прадмовы] // Літаратура XI–XVI стагоддзяў / Уклад. і камент. А.У. Бразгунова, І.У. Будзько, Л.В. Ляўшун ; прадм. У.В. Гніламёдава ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – С. 167–185.

*ЛІТАРАТУРА:*

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. Т.1. Даўняя літаратура : XI– першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 260–309.

Конан, У.М. Скарына Францішак / У.М. Конан, С.А. Подокшын, І.А. Юхо // Асветнікі зямлі Беларускай : Энцыкл. даведнік / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.] ; маст. У.М. Жук. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 389–398.

*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:*

Лойка, А.А. Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі / А.А. Лойка // Старабеларуская літаратура : Падручнік / А.А. Лойка. – Мінск : Выш. школа, 2001. – С. 208–225.

Лойка, А.А. Францыск Скарына / А.А. Лойка // Старабеларуская літаратура : Падручнік / А.А. Лойка. – Мінск : Выш. школа, 2001. – С. 257–310.

## Тэма 4. Я. Вісліцкі і М. Гусоўскі – прадстаўнікі літаратуры эпохі Адраджэння

1. Звесткі з біяграфіі Я. Вісліцкага. Творчае супрацоўніцтва з Паўлам з Кросна.
2. Паэма "Пруская вайна" як выдатны ўзор гераічнага рыцарскага эпасу. Сінтэз традыцый грэка-рымскай міфалогіі і старабеларускага летапісання. Творчая гісторыя паэмы. Асаблівасці мастацкай кампазіцыі твора. Захапленне аўтара велічнай гісторыяй усходніх славян.
3. Вобраз Ягайлы і яго жонкі Соф'і Гальшанскай як родапачынальнікаў дынастыі польскіх каралёў. Неадназначнасць у ацэнках усходняй палітыкі Польшчы, яе ўзаемадачыненняў з Масковіяй.
4. Звесткі з біяграфіі М. Гусоўскага. Асоба паэта-патрыёта, дыпламата і палітыка.
5. "Песня пра зубра" М. Гусоўскага як узор лацінамоўнай рэнесансавай паэзіі Беларусі XVI ст. Творчая гісторыя. Вобраз радзімы і сімволіка зубра ў творы. Ідэя абароны і нацыянальнага ўзвышэння народа як ідэйна-сэнсавы стрыжань паэмы.
6. Вобраз Вітаўта ў "Песні пра зубра" М. Гусоўскага. Асуджэнне міжусобіц і спачуванне сацыяльным нізам. Настальгія па гіраічным мінулым і ідэалізацыя века Вітаўта.

7. Мастацкія асаблівасці “Песні пра зубра”. Арыгінальнасць кампазіцыі і прасторава-часавых планаў паэмы. Сувязь з традыцыяй “Слова пра паход Ігаравы”.

*КРЫНІЦЫ:*

Вісліцкі, Я. Пруская вайна / Я. Вісліцкі // Літаратура XI–XVI стагоддзяў / Уклад. і камент. А.У. Бразгунова, І.У. Будзько, Л.В. Ляўшун ; прадм. У.В. Гніламёдава ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – С. 192–269.

Вісліцкі, Я. Пруская вайна / Я. Вісліцкі // JoannisVisliciensis. BellumPrutenum = Ян Вісліцкі. Пруская вайна : На лацін. і беларус. мовах / Уклад., перакл., камент. Ж.В. Некрашэвіч-Кароткай. – Мінск : Прапілеі, 2005. – С. 113–171.

Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі // Літаратура XI–XVI стагоддзяў / Уклад. і камент. А.У. Бразгунова, І.У. Будзько, Л.В. Ляўшун ; прадм. У.В. Гніламёдава ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – С. 238–269.

Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі // Старажытная беларуская літаратура : зборнік / Уклад. Л.С. Курбека ; аўт прадм. У.Г. Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – С. 119–154.

*ЛІТАРАТУРА:*

Жлутка, А.А.МіколаГусоўскі / А.А. Жлутка // Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. Т.1. Даўняя літаратура : XI– першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 309–357.

Лойка, А.А. Ян Вісліцкі / А.А. Лойка // Старабеларуская літаратура : Падручнік / А.А. Лойка. – Мінск : Выш. школа, 2001. – С. 225–236.

*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:*

Дарашкевіч, В.І. Гусоўскі Мікола // Асветнікі зямлі Беларускай : Энцыкл. даведнік / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.] ; маст. У.М. Жук. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 127–128.

Лойка, А.А. Мікола Гусоўскі / А.А. Лойка // Старабеларуская літаратура : Падручнік / А.А. Лойка. – Мінск : Выш. школа, 2001. – С. 236–256.

Ян Вісліцкі // Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. Т.1. Даўняя літаратура : XI– першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 269–271.

## Тэма 5. Літаратура перыяду Рэфармацыі і Контрэфармацыі

1. Рэфармацыя і Контрэфармацыя як грамадска-культурная з’ява. Рэфарматарскія плыні на Беларусі ў XVI ст.
2. Асоба і постаць С. Буднага як рэлегійнага і сацыяльнага рэфарматара, асветніка і мысліцеля. Яго творчасць на беларускай мове (“Катэхізіс”, “Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам”). Патрыятычныя ідэі, погляды на мову, асвету, крытыка князёў і духавенства ў Прадмове да “Катэхізіса”.
3. В. Цяпінскі як прадаўжальнік кнігавыдавецкіх і асветніцкіх традыцый Ф. Скарыны і С. Буднага. Пераклад і выданне “Евангелля”. Пытанні абароны і развіцця роднай мовы і культуры ў Прадмове да “Евангелля”.

*КРЫНІЦЫ:*

Анталогія даўняй беларускай літаратуры. – Мінск, 2003. – С. 400–411.

*ЛІТАРАТУРА:* Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. Т.1. Даўняя літаратура : XI– першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 382–406.

## Тэма 6. Царкоўна-палемічная літаратура

1. Сацыяльна-палітычныя перадумовы з'яўлення царкоўна-палемічнай літаратуры.
2. Царкоўна-палемічная публіцыстыка ва ўмовах абвастрэння сацыяльна-палітычнай і рэлігійнай барацьбы пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 года.
3. "Трэнас" М. Сматрыцкага як выдатны ўзор царкоўна-палемічнай публіцыстыкі пачатку XVII ст. Кампазіцыя і ідэйны змест твора. Вобраз праваслаўнай царквы ў творы.
4. А. Філіповіч – арыгінальны пісьменнік-палеміст другой чвэрці XVII ст. Мастацкія і жанравыя асаблівасці "Дыярыуша".

*КРЫНІЦЫ:*

Анталогія даўняй беларускай літаратуры. – Мінск, 2003. – С. 609–674.

*ЛІТАРАТУРА:*

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. Т.1. Даўняя літаратура : XI– першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 501–610.

## Тэмы 7–8. Літаратура эпохі барока і Асветніцтва

1. Барока як эпоха і літаратурны напрамак, яго сувязь з ідэалогіяй Конррэфармацыі. Эстэтыка барока. Літаратура трох "штыляў".
2. Гісторыка-мемуарная літаратура другой паловы XVI– XVII ст. як выяўленне рэнесансавага росту асобы і яе духоўнага жыцця. Жанравыя формы дзённіка, запісак, успамінаў.
3. "Допісы" Ф. Кміты-Чарнабыльскага. Адлюстраванне гістарычных падзей. Асоба аўтара ў творы, яго погляды.
4. "Дзённік" Ф. Еўлашоўскага як мастаукі дакумент нораваў, побыту і светапогляду беларускай шляхты XVI ст. Асоба аўтара ў творы, яго погляды.
5. Літаратура позняга барока. Паэзія. Парадыйная проза "Прадмова Мялешкі" і "Ліст да Абуховіча", інш.).
6. Творчасць С. Полацкага як прадстаўніка эпохі барока.
7. Беларуская літаратура эпохі Асветніцтва. Зборнік "Торба смеху" Кароля Жэры.

**Тэма 9. Станаўленне рамантызму ў новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя.**

1. Станаўленне і развіццё новай беларускай літаратуры XIX ст., яе перыядызацыя, агульная характарыстыка. Жанры, плыні, кірункі, стыль.

2. Станаўленне рамантызму ў новай беларускай літаратуры XIX ст. Вытокі. Прадстаўнікі рамантызму ў еўрапейскай і беларускай літаратуры. Паэтыка рамантычнага твора.

3. Роля філаматаў і філарэтаў у развіцці новай беларускай літаратуры.

4. Творчасць А. Міцкевіча, яе ўплыў на беларускую літаратуру. Жанравая разнастайнасць твораў. Беларуская гісторыя і фальклор як крыніцы натхнення вялікага паэта. Паэмы "Гражына", "Дзяды", "Пан Тадэвуш".

5. Творчасць Я. Чачота. Маральна-этычная праблематыка балад "Свіцязь-возера", "Мышанка", "Навагрудскі замак", "Калдычэўскі шчупак"). Балады Я. Чачота. Фалькларысцкая дзейнасць ("Сялянскія песні").

*ТВОРЫ:*

1. Баршчэўскі, Я. Шляшціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі ; Уклад., пер. з польскай мовы і камент. М. Хаустовіча. – Мінск : Маст. літ. – 383 с.
2. Міцкевіч, А. Выбраныя творы : Перакл. з пол. / А. Міцкевіч ; Уклад., прадм. і камент. К. Цвіркі. – Мінск : "Беларускі кнігазбор", 2003. – 460 с.

*ЛІТАРАТУРА:*

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX ст.ст. : у 2 т. Т. 2. Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX ст.ст. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2007.
2. Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. Ч. 1. / А. Лойка. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйш. школа, 1989. – С. 92–99.
3. Цвірка, К. Вялікі пясняр Беларусі / К. Цвірка // Выбраныя творы : Перакл. з пол. / А. Міцкевіч ; Уклад., прадм. і камент. К. Цвіркі. – Мінск : "Беларускі кнігазбор", 2003. – С. 5–34.
4. Хаустовіч, М. Гісторыя беларускай літаратуры 30–40 гг. XIX ст. / М. Хаустовіч. – Мінск, 2002.

**Тэма 10. Літаратура 20–40-х гадоў XIX ст.**

1. Агульная характарыстыка літаратуры 20–40-х гг. XIX ст. Творчасць П. Багрыма і Ф. Савіча.

2. Паэма "Энеіда навыварат" – адзін з першых буйных твораў новай беларускай літаратуры XIX ст. Час напісання. Праблема аўтарства. Парадыйна-сатырычны змест твора.

3. Творчасць Я. Баршчэўскага. "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" як мастацкі твор. Кампазіцыя, маральна-рэлігійная праблематыка, вобразная сістэма твора.

1. Згадайце звесткі з біяграфіі Я. Баршчэўскага. Хто з пісьменнікаў XIX ст. і ў якіх працах звяртаўся да гэтага матэрыялу?

2. Вызначце месца вершаў Я. Баршчэўскага ў гісторыі новай беларускай літаратуры. Зрабіце аналіз вершаў «Дзеванька», «Гарэліца», «Бунт хлопаў» («Рабункі мужыкоў»).

3. Які з твораў пісьменніка зрабіў яго вядомым пісьменнікам XIX ст.?

4. Раскажыце пра творчую задуму, час напісання і кампазіцыю кнігі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». З якімі творамі іншых пісьменнікаў параўноўваюць даследчыкі твор?

5. Хто зрабіў пераклад «Шляхціца Завальні» на беларускую мову? Якія новыя факты з гісторыі Беларусі і з біяграфіі Я. Баршчэўскага падае М. Хаустовіч у пасляслоўі да беларускамоўнага выдання кнігі? Ці падзяляецце вы думку ўкладальніка гэтай кнігі, што напісаныя па-польску «фантастычныя апавяданні Я. Баршчэўскага неслі магутны зарад беларускай нацыянальнай ідэі»?

6. Вызначце ролю ў кнізе ўступных артыкулаў «Слова ад аўтара» і «Нарыс паўночнай Белай Русі». Для чаго яны змешчаны ў кнізе?

7. Раскрыйце вобраз шляхціца Завальні, акрэсліце яго ролю ў творы.

8. Падрыхтуйце аналіз 2-3 апавяданняў са «Шляхціца Завальні».

9. Што дало падставы А. Лойка назваць кнігу Я. Баршчэўскага арыгінальным і ўнікальным помнікам беларускай літаратуры? Чым цікавы твор для сучаснага чытача?

10. Паразважайце, для чаго ў выданні М. Хаустовіча разам са «Шляхціцам Завальнем» друкуюцца артыкулы Рамуальда Падбярэскага «Беларусь і Ян Баршчэўскі» і Юльяна Барташэвіча «Ян Баршчэўскі».

11. У рэчышчы якога літаратурнага напрамку працаваў Я. Баршчэўскі?

12. Якія творы сведчаць пра жанравую разнастайнасць творчасці Я. Баршчэўскага?

*ТВОРЫ:*

1. Баршчэўскі, Я. Шляшціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі ; Уклад., пер. з польскай мовы і камент. М. Хаустовіча. – Мінск : Маст. літ. – 383 с.
2. Баршчэўскі, Я. Дзве бярозы / Я. Баршчэўскі // Беларусь. – 1995. – № 4.
3. Баршчэўскі, Я. Душа не ў сваім целе : аповесць / Я. Баршчэўскі // Полымя. – 1996. – № 1.
4. Баршчэўскі, Я. Санет для В.П. Буйніцкай ; Рыбак (балада) ; Зарослае возера (балада) / Я. Баршчэўскі // Роднае слова. – 1994. – № 3.

*АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА:*

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX ст.ст. : у 2 т. Т. 2. Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX ст.ст. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2007.
2. Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. Ч. 1. / А. Лойка. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйш. школа, 1989. – С. 92–99.
3. Хаустовіч, М. На парозе забытае святыні : Творчасць Я. Баршчэўскага / М. Хаустовіч. – Мінск, 2002.

*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:*

1. Мальдзіс, А. Падарожжа ў XIX стагоддзе / А. Мальдзіс. – Мінск, 1969. – С. 25–39.
2. Хаустовіч, М. Гісторыя беларускай літаратуры 30–40 гг. XIX ст. / М. Хаустовіч. – Мінск, 2002.
3. Хаустовіч, М. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага / М. Хаустовіч. – Мінск, 2003.

**Тэма 11–12. Літаратурны працэс 50-70-х гадоў XIX ст.**

1. Дайце характарыстыку літаратурнаму працэсу 50-70-х гадоў XIX ст.
2. Раскрыйце змест і мастацкія асаблівасці ананімных твораў гэтага часу.
3. Вызначце месца і ролю паэмы «Тарас на Парнасе» ў гісторыі беларускай літаратуры.
4. Паэма «Мачаха» Адэлі з Устроні.
5. Акрэсліце шматграннасць творчых інтарэсаў **У. Сыракомлі**

5.1. Звесткі з біяграфіі пісьменніка. Беларусь у яго лёсе.
5.2. Прыход у літаратуру. Раннія творы («Паштальён», «Хадыка», «Ілюмінацыя», «Жменя пшаніцы», інш.).
5.3. Асноўныя матывы польскамоўнай лірыкі.
5.4. Лёс беларускамоўнай спадчыны паэта.
5.5. Сыракомля як літаратурны крытык і даследчык беларускай культуры.
5.6. Значэнне творчасці У. Сыракомлі для беларускай літаратуры.

6. **Адам Кіркор**

6.1. Звесткі з біяграфіі.
6.2. А. Кіркор як гісторык беларускай літаратуры ў курсе лекцый «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў».
6.3. Нарысы пра Беларусь, змешчаныя ў «Живописной России»А. Кіркора.
6.4. Значэнне творчай спадчыны.

7. **Вінцусь Каратынскі**

7.1. Біяграфія і асаблівасці светапогляду.
7.2. Выданне кніг «Чым хата багата, тым рада», «Таміла», «Выпіў куба да Якуба».
7.3. Антыпрыгонніцкі пафас паэмы «Таміла».
7.4. Беларускамоўная паэзія «Уставайма, братцы...», «Далібог-то, Арцём...», «Туга на чужой старане...».
7.5. Значэнне твораў В. Каратынскага ў гісторыі беларускай літаратуры.

8. **Адам Плуг**

8.1.Звесткі з біяграфіі. Беларусь у лёсе пісьменніка.
8.2.Ацэнка творчасці Дуніна-Марцінкевіча ў нарысе «Некалькі ўражанняў з падарожжа па Літве»
8.3.Творчасць на беларускай мове
8.4.Сувязь апавядання «Кручаная баба» з беларускім фальклорам.

9. **Юльян Ляскоўскі**

9.1. Звесткі з біяграфіі.
9.2. Паэтычны зборнік на польскай мове «Беларускі бандурыста».
9.3. Беларускі фальклорна-этнаграфічны матэрыял у паэме «На чужой старане».
9.4. Беларускамоўныя вершы «Зямелька мая», «Пад дуду».

10. **Артём Вярыга-Дарэўскі**

10.1. Звесткі з біяграфіі.
10.2. Роля дзеяча ў кансалідацыі літаратурна-грамадскіх сіл на Віцебшчыне і ў цэлым на Беларусі.

10.3. Рукапісны «Альбом» Вярыгі-Дарэўскага і яго гісторыка-літаратурнае значэнне.
10.4. Беларускамоўныя творы паэта.
**11.** Звесткі пра дзейнасць Аляксандра Рыпінскага, Гераніма Марцінкевіча, Ялегі Вуля, Кастуся Каліноўскага, інш.

*ЛІТАРАТУРА:*

Асветнікі зямлі Беларускай : Энцыкл. даведнік / Рэдкал. : Г. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2001.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX ст.ст. : у 2 т. Т. 2. Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX ст.ст. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2007.

Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. Ч. 1. / А. Лойка. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйш. школа, 1989. – С. 100–142.

## Тэма 13. Творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча

1. Згадайце звесткі з біяграфіі В. Дуніна-Марцінкевіча, вызначце асноўныя перыяды яго жыцця і творчасці.
2. Раскрыйце вытокі творчасці і светапогляд В. Дуніна-Марцінкевіча.
3. Што сабою ўяўляла ранняя творчасць пісьменніка? Раскрыйце ідэйны змест “Ідыліі”, яе жанравыя асаблівасці, вобразную сістэму твора. Хто з герояў быў любімым героем аўтара? У чым асаблівасці мовы “Ідыліі”?
4. Якія творы пісьменніка складаюць яго эпічную спадчыну?
5. Раскажыце пра месца паэмы “Гапон” у творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча.
6. Акрэсліце праблематыку і мастацкія асаблівасці вершаваных аповесцей “Травіца брат-сястрыца”, «Злая жонка».
7. Вызначце асаблівасці дарэформеннай творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча.
8. Якія адносіны меў пісьменнік да паўстання 1863–1864 гадоў?
9. Якія творы былі напісаны Дунінам-Марцінкевічам ў парэформенны перыяд?
10. Зрабіце аналіз камедыі “Пінская шляхта” (жанравая спецыфіка, ідэйны змест, вобразы персанажаў, г. д.). Вызначце ролю твора ў эвалюцыі мастака.
11. Што сабой уяўляла камедыя «Залёты»? Чым яна адрознівалася ад папярэдніх твораў В. Дуніна-Марцінкевіча? Што давала падставы даследчыкам (А. Лойка) назваць вобраз Сабковіча творчай удачай аўтара?
12. Акрэсліце ролю і значэнне В. Дуніна-Марцінкевіча і яго творчасці ў гісторыі новай беларускай літаратуры. На якой падставе яго лічаць першым беларускім прафесійным пісьменнікам?

*ТВОРЫ:*

Дунін-Марцінкевіч, В. Творы / В. Дунін-Марцінкевіч ; уклад., прадм. і камент. Я. Янушкевіча. – Мінск, 1984. – 528 с.

*АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА:*
Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX ст.ст. : у 2 т. Т. 2. Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX ст.ст. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2007.
Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. Ч. 1. / А. Лойка. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйш. школа, 1989. – С. 143–177.
Янушкевіч, Я. "Ён першы сеяў зярняты..." / Я. Янушкевіч // Дунін-Марцінкевіч, В. Творы / В. Дунін-Марцінкевіч ; уклад., прадм. і камент. Я. Янушкевіча. – Мінск, 1984. – С. 3–16.
*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:*
Кісялёў, Г. спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча / Г. Кісялёў. – Мінск, 1988.
Навуменка, І. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч / І. Навуменка. – Мінск, 1992.
Янушкевіч, Я. Беларускі Дудар / Я. Янушкевіч. – Мінск, 1991.

## Тэма 14. Творчасць Францішка Багушэвіча

1.Згадайце звесткі з біяграфіі Ф. Багушэвіча. Якія факты біяграфіі ўплывалі на фармаванне светапогляду будучага пісьменніка?
2.Раскрыйце шматграннасць творчай дзейнасці Ф. Багушэвіча.
3.Што сабой уяўляла паэтычная спадчына пісьменніка? Як склаўся лёс зборніка «Скрыпачка беларуская»?
3.1 Вызначце месца ў ёй зборніка «Дудка беларуская». Раскрыйце яго ідэйны змест, тэматыку, вобраз Мацея Бурачка, інш.
3.2 Прааналізуйце вершы «Мая дудка», «Дурны мужык, як варона», «Бог не роўна дзеле», «У астрозе», «Быў у чыстцы», інш. Якія творы сведчаць пра жанравую разнастайнасць паэзіі Ф. Багушэвіча?
3.3 Зрабіце аналіз вершаванай аповесці «Кепска будзе». Патлумачце сэнс назвы твора.
3.4 Чым падобны да «Дудкі беларускай» другі зборнік Ф. Багушэвіча «Смык беларускі» і чым яны адрозніваюцца?
3.5 Прааналізуйце вершы «Гора», «Чаго бяжыш, мужычок?», «Ахвяра», «Не цурайся», інш.
4.Што сабою ўяўляла проза Ф. Багушэвіча? Як называўся забаронены цэнзурай зборнік празаічных твораў пісьменніка?
4.1 Зрабіце аналіз апавяданняў «Тралялёначка», «Палясоўшчык», «Сведка», «Дзядзіна».
5. Раскрыйце публіцыстычную дзейнасць Ф. Багушэвіча. Вызначце тэматыку і праблематыку прадмоваў да зборнікаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі».
6. Што дало падставы даследчыкам назваць Ф. Багушэвіча песняром Беларускага Адраджэння?
7.Акрэсліце ролю і значэнне Ф. Багушэвіча і яго творчасці ў гісторыі беларускай літаратуры.

**ТВОРЫ:** Багушэвіч, Ф. Творы : Вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты / Ф. Багушэвіч ; уклад., прадм. і камент. Я. Янушкевіча. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 309 с.

*АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА:*

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX ст.ст. : у 2 т. Т. 2. Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX ст.ст. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2007.

Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. Ч. 1. / А. Лойка. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйш. школа, 1989. – С. 246–278.

Янушкевіч, Я. Абаронца праўды / Я. Янушкевіч // Творы : Вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты / Ф. Багушэвіч ; уклад., прадм. і камент. Я. Янушкевіча. – Мінск, 1991. – С. 3–14.

*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:*

Асветнікі зямлі Беларускай : Энцыкл. даведнік / Рэдкал. : Г. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – С. 40–45.

Кісялёў, Г. Ад Чачота да Багушэвіча / Г. Кісялёў. – Мінск, 2003.

## Тэма 15. Паслядоўнікі Францішка Багушэвіча

1. Ахарактарызуйце літаратурна-грамадскае жыццё Беларусі 80–90-х гадоў XIX ст.
2. Згадайце звесткі з біяграфіі Я. Лучыны. Якія факты біяграфіі ўплывалі на фармаванне светапогляду будучага пісьменніка?
3. Раскрыйце праблематыку і мастацкія асаблівасці твораў Я. Лучыны «Не я пяю – народ божы», «Роднай старонцы», «Сівер», «Вясна», «Мароз», «Што думае Янка, везучы дровы ў горад», «Горсць пшаніцы», «Стары ляснік».
4. Як адлюстраваў пісьменнік жыццё прыроды і людзей Палесся XIX ст. у паэме «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся»?
5. Згадайце звесткі з біяграфіі А. Гурыновіча. Якія факты біяграфіі ўплывалі на фармаванне светапогляду будучага пісьменніка?
6. Раскрыйце праблематыку і мастацкія асаблівасці твораў «Дзякуй табе браце, Бурачок Мацею», «Перш душылі паны», «Што ты спіш, мужычок?», «Вясна», «Бор», інш.
7. Вызначце месца перакладчыцкай дзейнасці ў творчасці А. Гурыновіча.
8. Акрэсліце ролю творчасці Альгерда Абуховіча ў развіцці літаратуры канца XIX ст.
9. Раскажыцццё пра жыццё і творчасць Феликса Тапчэўскага.

*ТВОРЫ:*

Абуховіч, А. Творы. – Мінск, 1991.

Лучына, Я. Творы / Я. Лучына. – Мінск, 1988.

Лучына, Я. Паляўнічыя акварэлькі з Палесся : Паэма / Я. Лучына ; Пер. з польск. мовы Г. Тумаш. – Мінск, 2003.

Беларуская літаратура XIX ст. : Хрэстаматыя. – Мінск, 1988.

*АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА:*

Асветнікі зямлі Беларускай : Энцыкл. даведнік / Рэдкал. : Г. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2001.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX ст.ст. : у 2 т. Т. 2. Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX ст.ст. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2007.

Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. Ч. 1. / А. Лойка. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйш. школа, 1989.

*ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:*

История белорусской дооктябрьской литературы. – Минск, 1977.

Кісялёў, Г. Ад Чачота да Багушэвіча / Г. Кісялёў. – Мінск, 2003.

Мархель, У. Крыніцы памяці / У. Мархель. – Мінск, 1990. – С. 143–176.

Родчанка, Р. Альгерд Абуховіч-Бандынэлі : Нарыс жыцця і творчасці. – Мінск, 1984.

## Тэма 16. Творчасць Элізы Ажэшкі

1. Агульная характарыстыка беларускай літаратуры 50–70-х гг. XIX ст. Дзейнасць У. Сыракомлі, А. Кіркора, А. Вярыгі-Дарэўскага, інш.
2. В. Дунін-Марцінкевіч як першы прафесійны пісьменнік беларускай літаратуры. Эстэтычныя погляды. Творчасць дарэформеннага перыяду (лібрэта оперы “Ідылія”, “Гапон”, пераклады, інш.).
3. Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча парэформеннага перыяду. Фарс-вадэвіль “Пінская шляхта”. Кампазіцыя твора. Сатырычны паказ маральнага аблічча шляхты і выкрыццё царскага чыноўніцтва. Моўная характарыстыка персанажаў.
4. Паэма “Тарас на Парнасе” ў гісторыі беларускай літаратуры. Праблема аўтарства. Вобразная сістэма твора. Асаблівасці мовы.
5. Агульная характарыстыка літаратурнага працэсу 80–90-х гг. XIX ст. Ідэйна-мастацкія плыні ў беларускай літаратуры канца XIX ст. (народніцкая, ліберальна-асветніцкая, рэвалюцыйна-дэмакратычная, кансерватыўная) і іх прадстаўнікі.
6. Месца і роля Ф. Багушэвіча ў беларускай літаратуры. “Прадмова” да зборніка “Дудка беларуская” як маніфест беларускага адраджэнскага руху.
7. Паэтычныя зборнікі Ф. Багушэвіча “Дудка беларуская” і “Смык беларускі”. Паэма “Кепска будзе”. Спалучэнне нацыянальнай, сацыяльнай і маральнай праблематыкі ў творчасці Ф. Багушэвіча.
8. Проза Ф. Багушэвіча. Сувязь з фальклорам (“Сведка”, “Палясоўшчык”, “Дзядзіна”). Сацыяльная праблематыка апавядання “Тралялёначка”.
9. Творчасць Я. Лучыны. Польскамоўная і беларускамоўная спадчына. Зборнік “Вязанка”. Асаблівасці творчай манеры пісьменніка.
10. А. Гурыновіч як прадстаўнік рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў беларускай літаратуры канца XIX ст. Публіцыстычнасць і грамадзянскасць вершаў. Пераемнасць з творчасцю Ф. Багушэвіча.